Парламенцкі дзённік

# ЗМЯНЕННІ, ПРАДЫКТАВАНЫЯ ЧАСАМ

## Дэпутаты разгледзелі змяненні ў Закон «Аб сродках масавай інфармацыі» і адобрылі Закон «Аб народным апалчэнні»

**І калі законапраект, якім уносяцца карэктывы ў дзейнасць медыйнай сферы, у Авальнай зале чыталі ўжо другі раз, то Закон «Аб народным апалчэнні» парламентарыям быў прадстаўлены ўпершыню. Увогуле, гэта першы падобны законапраект у нашай краіне — сучасная абстаноўка ў свеце патрабуе павышанай увагі да пытання абараназдольнасці.**

### УСЕНАРОДНЫ ХАРАКТАР АБАРОНЫ

Праект закона, які падрыхтаваны Міністэрствам абароны, накіраваны на ўстанаўленне прававых асноў рэалізацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, права на добраахвотны ўдзел у забеспячэнні ваеннага становішча ў Беларусі. У прыватнасці, праектам закона вызначаюцца тэрміны «народнае апалчэнне», «атрад народнага апалчэння» і «добраахвотнік народнага апалчэння», агульныя пытанні фінансавага і матэрыяльнага забеспячэння народнага апалчэння. Прадугледжаны абмежаванні пры залічэнні грамадзян у народнае апалчэнне, а таксама парадак кіраўніцтва народным апалчэннем, фарміравання, камплектавання і дыслакацыі атрадаў народнага апалчэння, выканання імі задач. Прапісаны паўнамоцтвы дзяржаўных органаў і службовых асоб у сферы дзейнасці народнага апалчэння.

— Аналіз сучасных войнаў сёння дазваляе зрабіць высновы, што абарона Айчыны павінна насіць усенародны і масавы характар. Менавіта такія задачы і вырашае Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным апалчэнні», — падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Яўген ЗАЙЦАЎ**. — Прыняцце дадзенага законапраекта дасць магчымасць стварыць неабходныя ўмовы для падтрымання правапарадку на адміністрацыйных тэрыторыях, захавання маёмасці грамадзян, юрыдычных асоб усіх формаў уласнасці, а таксама для аказання садзейнічання тэрытарыяльным органам унутраных спраў у забеспячэнні мерапрыемстваў ваеннага становішча. Вядома, гэта дасць магчымасць грамадзянам добраахвотна браць удзел ва ўзброенай абароне свайго дому, родных і блізкіх, свайго населенага пункта, хатняга ачага — і такім чынам удзельнічаць ва ўзброенай абароне нашай дзяржавы.

### ПАВЫШЭННЕ АДКАЗНАСЦІ Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І ВЫДАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

Законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», адобраны парламентарыямі ў другім чытанні, накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі, абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, нацыянальнай бяспекі ў сферы масавай інфармацыі. У ходзе падрыхтоўкі да разгляду ў другім чытанні ў тэкст праекта закона ўнесены праўкі ўдакладняльнага і тэхнічнага характару. У прыватнасці, ліквідаваны супярэчнасці паміж асобнымі нормамі Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» і Указа Прэзідэнта ад 22 сакавіка 2022 года № 116 «Аб навінавых агрэгатарах у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт».

У першым чытанні разгледжаны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Дакумент распрацаваны з мэтай удасканалення прававога рэгулявання грамадскіх адносін у сферы выдавецкай справы. Асноўныя палажэнні праекта накіраваны на пашырэнне пераліку падстаў для перарэгістрацыі выдаўцоў і вытворцаў друкаваных выданняў, а таксама пераліку падстаў для прыпынення і спынення дзеяння пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў. Акрамя таго, пашыраюцца паўнамоцтвы Міністэрства інфармацыі, у тым ліку ў прыняцці рашэння аб спыненні дзеяння пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі для выдаўцоў друкаваных выданняў.

### РЭФОРМА ДЛЯ БІЗНЕС-СУПОЛЬНАСЦІ

У першым чытанні парламентарыі адобрылі праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці».

Як адзначыў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Анатоль НАСЕНЯ**, законапраект прайшоў беспрэцэдэнтнае абмеркаванне ў грамадстве з прыцягненнем практычна ўсіх катэгорый бізнес-супольнасці: ад індывідуальных прадпрымальнікаў да прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. «Нават буйны бізнес з задавальненнем падключыўся да абмеркавання гэтага законапраекта, — заўважыў дэпутат. — Што больш за ўсё цікавіла прадстаўнікоў бізнесу? Асноўны пасыл, закладзены ў законапраекце, — тыя напрамкі, у якіх індывідуальныя прадпрымальнікі сапраўды змогуць сябе рэалізаваць, працуючы далей, не жадаючы трансфармавацца ў камерцыйную арганізацыю: гэта значыць, чым яны змогуць займацца і на якіх умовах тое будзе».

«Па-ранейшаму застаюцца актуальнымі і патрабуюць дапрацоўкі, вывучэння пытанні адносна мікраарганізацый, — паведаміў Анатоль Насеня. — Законапраектам прадугледжана выключэнне дадзенай катэгорыі. Аднак мы мяркуем, што малыя камерцыйныя арганізацыі колькасцю да 50 чалавек будуць мець тыя правы, якія былі для мікраарганізацый. Гэта значыць захоўваем найбольш лаяльны рэжым функцыянавання. Застаюцца адкрытымі пытанні па камунальных паслугах. Законапраектам прадугледжана, што юрыдычны адрас у індывідуальнага прадпрымальніка пры трансфармацыі застаецца па месцы жыхарства. Згаданае пытанне таксама патрабуе некаторай дапрацоўкі, у тым ліку з прадстаўнікамі ЖКГ. Законапраектам заяўлена тое, што такая трансфармацыя будзе адбывацца ў кароткія тэрміны, гэта будзе бясплатна».

Дэпутат падкрэсліў, што ў цэлым рэформа бізнес-супольнасцю ўспрымаецца канструктыўна.

### ДЛЯ РЭДКІХ ПАТАЛОГІЙ — БЯСПЛАТНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ ЗА МЯЖОЙ

У першым чытанні дэпутацкім корпусам разгледжаны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя».

— Прайшло практычна два гады з таго часу, як мы працуем па абноўленым Законе «Аб ахове здароўя», у які мы ўнóсілі вялікую колькасць змяненняў, але жыццё настолькі дынамічнае, што наспела неабходнасць зноў уносіць змяненні, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Людміла МАКАРЫНА-КІБАК**. — Калі казаць пра аказанне медыцынскай дапамогі, што вельмі важна для людзей, якія пакутуюць, напрыклад, ад рэдкіх захворванняў (анкалагічныя, прыроджаныя), — гэта забеспячэнне іх лекавымі прэпаратамі. Прадугледжваецца магчымасць закупкі лекавых прэпаратаў для людзей з такімі паталогіямі, часам нават персанальна пад нейкага чалавека. Акрамя таго, не заўсёды ёсць магчымасць пры пэўнай цяжкай ці рэдкай паталогіі аказаць чалавеку медыцынскую дапамогу ў Рэспубліцы Беларусь. У прыведзеным законапраекце мы ўносім змяненні, каб такому чалавеку неабавязкова было выязджаць за межы краіны, а накіраваць біялагічны матэрыял для кансультавання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

### СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ВАЕННАЙ СФЕРЫ

Таксама ў другім чытанні быў прыняты праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін», ратыфікаваны шэраг дакументаў. У прыватнасці, адобраны законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб сумесным забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі ў ваеннай сферы ад 19 снежня 1997 года». Дэталізуюцца нормы Пагаднення аб рэгіянальнай групоўцы войскаў (сіл) Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі: прадугледжваецца магчымасць дыслакацыі злучэнняў і воінскіх часцей расійскай часткі гэтай групоўкі, аб'ектаў ваеннай інфраструктуры Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, якія забяспечваюць іх функцыянаванне.

Як падкрэсліў, прадстаўляючы дакумент, **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, на цяперашні момант тых мер, якія прымаюцца для забеспячэння бяспекі ваенным ведамствам сумесна з Расійскай Федэрацыяй, дастаткова. У сувязі з гэтым кіраўнік абароннага ведамства нагадаў аб падпісанні нядаўна разам з расійскім калегам Палажэнні аб парадку ўтрымання нестратэгічнай ядзернай зброі на тэрыторыі нашай краіны. «Гэта і ёсць тая дзейсная мера, якая павінна астудзіць агрэсіўны характар і ваяўнічую рыторыку, якая ідзе найперш ад нашых суседзяў, — адзначыў Віктар Хрэнін. — А тое, што ў інфармацыйным полі адбываецца, тут мы, вядома, будзем працаваць і далей».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ТЭХНАЛОГІІ, ШТО НАКОРМЯЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Памятаеце, як падчас «Белагра-2021» сацсеткі запоўнілі сэлфі з першым айчынным трактарам-беспілотнікам? Напэўна, інавацыйнымі дзівосамі «Белагра» пачасту наведвальнікаў і на гэты раз.

— Выстава будзе размешчана на плошчы больш за 28 тысяч квадратных метраў, — расказаў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Вадзім ШАГОЙКА**.

У рамках форуму пройдуць міжнародныя спецыялізаваныя выставы — у тым ліку «Белферма» і «Белпрадукт». **Адкрыецца выстава 6 чэрвеня і завершыцца — 11-га.** Айчынных аграрыяў, работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці і іх замежных калег, а таксама гасцей «сельскагаспадарчай ВДНГ» яна збярэ ў выставачным цэнтры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» (25 км ад Мінска і 6 км ад Нацыянальнага аэрапорта, дакладны адрас — пр. Пекінскі, 29).

### НА ЛЮБЫ ГУСТ

Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра-2023» сёлета будзе праводзіцца ўжо ў 33-і раз. Удзел у вядучым форуме аграрыяў возьмуць 450 кампаній з дзесяці краін свету. Акрамя гаспадыні мерапрыемства — Беларусі, гэта Расія, Кітай, Пакістан, Турцыя, Германія, В'етнам, Італія, Індыя і Палесціна. Для параўнання, летась у нашу краіну для ўдзелу ў «Белагра» прыехалі прадстаўнікі 425 кампаній з пяці краін. Таксама на «Белагра-2023» будуць прадстаўлены экспазіцыі 14 абласцей Расійскай Федэрацыі.

— Буйныя экспазіцыйныя блокі прадставяць Мінскі трактарны завод, «МАЗ», «Гомсельмаш», «Амкадор», Рэспубліканскае аб'яднанне «Белаграсэрвіс», «Бабруйскаграмаш», Мінскі маторны завод і шэраг іншых буйных кампаній, — адзначыў Вадзім Шагойка.

Ён дадаў, што больш за 90 % тэхнікі, якая выкарыстоўваецца на нашых палях, — айчыннай вытворчасці. На «Белагра» можна пераканацца, што па якасных і тэхнічных характарыстыках яна не саступае вядучым сусветным узорам.

Наведвальнікаў дакладна ўразіць «Белферма-2023». Там можна будзе ўбачыць абсталяванне для малочнатаварных фермаў, дзе за статкам сочыць і дагледае ўсяго некалькі апаратаў, а практычна ўсе працэсы — аўтаматызаваныя. Прафесіяналам будзе цікава азнаёміцца з новымі кармамі і дабаўкамі, ветэрынарнымі прэпаратамі, праграмным забеспячэннем і біяэнергетычнымі тэхналогіямі. А калі вы вырашылі пабываць на выставе ўсёй сям'ёй, дзецям будзе даспадобы наведаць «Рыбацкую вёску» — яе арганізуе ДА «Белводгас».

Дванаццаць прадпрыемстваў будзе прадстаўлена пладова-агародніннай прадукцыя, якая вырабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, расказаў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. Вялікая ўвага сёлета аддадзена тэме ўгнаенняў і сродкаў аховы раслін — яна будзе прадстаўлена чатырнаццацю прадпрыемствамі, паведаміў ён.

Выстава «Белпрадукт» размесціцца на плошчы больш за 1200 м$^2$, удзел у ёй возьмуць 132 беларускія вытворцы з усіх рэгіёнаў краіны. Будзе арганізаваны кірмаш прадуктаў харчавання. «Кулінарны раздзел» аграрнага форуму па ўжо існуючай традыцыі прадугледжвае багацце і размах. Дэгустацыі на такіх выставах праходзяць паўсюдна, усё ўзорна-паказальна, смачна, духмяна і гасцінна — цалкам рэальна «надэгуставацца» да абсалютнай сытасці. Да таго ж у розных частках выставы будзе працаваць 11 пунктаў харчавання. Словам, ідэальнае месца, каб напоўніць халадзільнік і зведаць новыя смакі.

Дарэчы, на заметку дачнікам — на «Белагра» можна будзе набыць не толькі агратэхніку і садавіну, але і насенне новых сартоў і гібрыдаў ад айчынных селекцыянераў: усходжасць — гарантуецца. Атрымлівацца зручна: ацаніў канчатковы вынік — набыў насенне.

— Праграма «Белагра-2023» прадугледжвае як інтарэсы прафесіяналаў, якія прыязджаюць на выставу для заключэння кантрактаў і выбудоўвання бізнес-адносін, так і наведвальнікаў, якія могуць на свае вочы ўбачыць дасягненні сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай галіны і прыемна правесці час, — падкрэсліў Вадзім Шагойка.

Новы кірунак у праграме «Белагра» — спартыўны блок: лёгкаатлетычны забег і праграма Рэспубліканскага цэнтра коннага спорту з удзелам алімпійцаў.

### ПЕРАГАВОРЫ І КАНФЕРЭНЦЫІ

Але ўсе вышэйпералічаныя атрыбуты свята разлічаны ў першую чаргу на тых наведвальнікаў, хто прыйшоў «проста паглядзець». Прафесіяналам падобныя форумы цікавыя ў зусім іншым ключы — у першую чаргу як пляцоўка для дзелавых сустрэч. У рамках «Белагра» прадугледжана каля двух дзясяткаў канферэнцый і семінараў, распавёў Вадзім Шагойка. Расклад кожнага дня прадугледжвае B2B-сустрэчы, дэманстрацыі і прэзентацыі, разлічаныя менавіта на прафесійны інтарэс.

— Ключавы момант ацэнкі міжнароднага супрацоўніцтва — тавараабарот і паступленне экспартнай выручкі, — адзначыў Вадзім Шагойка. — За мінулы год мы прыраслі па экспарце сельгаспрадукцыі, сельскагаспадарчай сыравіны і харчавання практычна на чвэрць. Сёлета тэндэнцыя захоўваецца: мы павялічваем экспартную выручку. «Белагра» — пляцоўка, якая спрыяе ўмацаванню сувязяў, заключэнню кантрактаў і канкрэтных дамоўленасцяў на доўгатэрміновую перспектыву.

Словам, на «Белагра-2023» цікава будзе ўсім катэгорыям наведвальнікаў. Застаецца толькі нагадаць, што выстава будзе працаваць з 6 да 11 чэрвеня ў парку «Вялікі камень» з 10 да 18.00. У гэтыя дні з Мінска ад станцыі метро «Магілёўская» будуць арганізаваны пастаянныя транспартныя зносіны.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**